«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Вынесены прысуд за абразу кадэбіста: два гады "хіміі"

20.05.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Суд Маскоўскага раёна Берасця 20 траўня вынес прысуд па крымінальнай справе Уладзіміра Шурубейкі, абвінавачанага ў абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса).

Справу разглядаў суддзя **Яўген Брэган**, дзяржабвінаваўца - **Дзягель.**

Паводле версіі следства, 22 верасня 2020 года Уладзімір Шурубейка ў адкрытым viber-чаце "Вычулкі.Ямна", "з мэтай прычынення шкоды аўтарытэту дзяржаўнай улады і кіраванню" размясціў паведамленне ў дачыненні да супрацоўніка органаў дзяржбяспекі Сямёнава Дзяніса, якое змяшчае ў сабе негатыўную ацэнку асобы, а менавіта назваў яго "с*ыкло, чмо і ныцік".

На папярэднім судовым пасяджэнні пракурор Дзягель у судовых спрэчках заявіў, што знаходзіць віну Шурубейкі цалкам даказанай, і папрасіў пакараць мужчыну 2 гадамі абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу - "хіміі".

Наконт папярэдне агучанай матэрыяльнай прэтэнзіі Дзяніса Сямёнава ў памеры 2 500 рублёў стала вядома, што пацярпелы яшчэ да суда атрымаў ад Шурубейкі 1 500, і заявіў, што прэтэнзій да яго больш не мае.



Судзяць берасцейца, які абразіў у Вайберы супрацоўніка КДБ

Судова-лінгвістычная экспертыза па крымінальнай справе заключыла, што выказванне Шурубейкі ў чаце ўтрымлівала негатыўную ацэнку асобы Сямёнава.

Сёння суддзя Маскоўскага суда Брэста Брэган абвясціў прысуд Шурубейку Уладзіміру: вінаваты. Пакаранне: **два гады абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу.** У тэрмін адбытага пакарання залічыць 3 дні, праведзеных пад вартай, а таксама перыяд з 7 красавіка па 22 мая пад хатнім арыштам.

Я рекомендую Твитнуть









Агляд навінаў палітвязняў з 19 па 26 верасня

Палітвязня, якога перазатрымалі па заканчэнні тэрміну, асудзілі па новай крымінальнай справе

Агляд навінаў палітвязняў з 12 па 19 верасня

Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 12 верасня







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Міжнародная супольнасць павінна палажыць канец беспакаранасці за злачынствы ў Беларусі"

Затрыманне тыктокера, абнаўленне "Спісу экстрэмістаў": хроніка пераследу 29 верасня (дапоўнена)

Былога сахраўца Юрыя Гараўскага апраўдалі па справе аб знікненні апазіцыйных палітыкаў (дапоўнена)

Старонка Беларускай праваабарончай школы — у "экстрэмісцкіх матэрыялах": хроніка пераследу 28 верасня

Наваполацк: Іллю Двойрына асудзілі за абліты фарбай аўтамабіль на крымскіх нумарах і літарай "Z"

"Па заданні латвійскіх спецслужб рыхтавала да вярбоўкі беларускіх вайскоўцаў". У Мінску распачынаецца суд за "агентурную дзейнасць"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMIO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY